ситета культуры и искусств в образовательном пространстве Республики Беларусь, так и специалистов, выпускаемых БГУКИ, а также реализации новой стратегии развития творческого вуза в современных условиях, упрочения положения БГУКИ на мировом рынке образовательных услуг.

1. *Плескачева, Н. М.* Развитие предпринимательской миссии вуза в рамках концепции «Университет 3.0»: тенденции и перспективы / Н. М. Плескачева // Высш. шк. – 2019. – № 2. – С. 7–11.

2. Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/pda/ru/news_ru/vruchenie-diplomov-doktora-nauk-i-attestatov-professora-nauchnym-i-nauchno-pedagogicheskim-rabotnikam-22921/. – Дата доступа: 29.01.2020.

3. Ереванское коммюнике [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://bolognaby.org/2016-04-11-14-03-5/zajavlenija-i-rezolutsii/183-erevanskoe-kommyunike. – Дата доступа: 03.02.2020.

4. Политика в области качества БГУКИ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.buk.by/smk/Doc/Politic/index.php. – Дата доступа: 29.01.2020

5. Дайджест новостей высшего образования и науки [Электронный ресурс]. – 2020. – № 1. – С. 5. – Режим доступа: http://nihe.bsu.by/images/otd-an/Digest_1_January_2020.pdf. – Дата доступа: 31.01.2020.

6. СТБ ISO 9001–2015. Системы менеджмента качества. Требования: Государственный стандарт Республики Беларусь. – Минск : БелГИСС, 2015. – 24 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Л. І. Доўнар,**
*кандыдат педедагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

# ВЫХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЧЫТАЦКАЙ АЎДЫТОРЫІ: ПАДЫХОДЫ І МЕТАДЫ

У адным з артыкулаў літаратурнага крытыка і журналіста Паўла Абрамовіча з яго кнігі «Мой спосаб чытання» (Мінск, 2019 г.) адзначана, што дзякуючы газеце «Наша Ніва» (1906–1915) і яе творчаму калектыву, які ў поўнай меры выкарыстоўваў прыёмы і метады журналісцкай працы, ужо на пачатку ХХ ст. у Беларусі была «сфармаваная нацыянальная чытацкая

аўдыторыя, выхаванае пакаленьне грамадзян, якое ведала і паважала нацыянальнае мастацкае слова» [10, с. 49]. Але сёння пытанне таксама застаецца актуальным.

Навошта і каму патрэбна выхаванне нацыянальнага чытача, калі чалавечае грамадства ўсё больш і больш глабалізуецца, аддаючы перавагу інтэрнэт-інфармацыі, калі для пакалення «Z» («цэнтэніялаў»)[1] настаўнік у сярэдняй і вышэйшай школе сёння больш не адзіная крыніца ведаў? У сучаснасці канцэптуальна змяняецца адукацыйная парадыгма, у тым ліку і ў Беларусі: у адпаведнасці з прынцыпамі Балонскага працэсу прыняты стратэгічны план па мадэрнізацыі нацыянальнай вышэйшай адукацыі; якасць адукацыі вызначае кампетэнтнасны падыход («ведаць, каб умець і дзейнічаць»), адукацыйнай каштоўнасцю становіцца крытычнае мысленне, а сярод абавязковых умоў, якія вызначаюць пасяховасць адукацыі, усё большую значнасць набывае акадэмічная мабільнасць.

Толькі сёння ўжо недастаткова разважаць, а неабходна дзейнічаць, ведаючы, што існуюць міжнародныя і дзяржаўныя праграмы, у якіх чытанню (і асабліва – чытанню на роднай мове) надаецца вельмі важная роля. І таму трэба прыняць усе неабходныя захады, каб разгарнуць паўнавартасныя дзяржаўныя праекты па падтрымцы і прамоцыі нацыянальнага чытання ў нашай краіне. Менавіта «чытацкая адукаванасць», ці «чытацкая кампетэнцыя» выступаюць сёння адным з трох базавых складнікаў пры ацэнцы адукацыйных дасягненняў навучэнцаў паводле адпаведных міжнародных праграм, як, напрыклад, PISA. Хаця маніторынг якасці адукацыі з дапамогай тэстаў PISA не дае прамога адказу на пытанне, як жа выхоўваць чытачоў, тым не менш ён адлюстроўвае пэўныя асновы для педагагічнага ўздзеяння ва ўяўленнях пра ўзроўні чытацкай адукаванасці, якія паслядоўна асвойвае кожны чытач. Чытацкая адукаванасць, – як сцвярджаецца кампетэнтнымі спецыялістамі, – становіцца здольнасцю чалавека разумець і выкарыстоўваць

[1] Пакаленне Z (англ. Generation Z) – тэрмін, які прымяняецца ў свеце для пакалення людзей, што нарадзіліся прыкладна ў 2000–2019 гг. Часта тэрмін «пакаленне Z» разглядаецца ў якасці сіноніма тэрміна «лічбавы чалавек». – Гл. напр.: Теория поколений в России. В каких условиях растет поколение Миллениум и Z и что станет их ценностями [Электронный ресурс]. – URL: https://rugenerations.su/2009/05/21/в-каких-условиях-растет-поколение-миллениум-и-Z-и-что-станет-их-ценностями. – Дата доступа: 28.01.2020.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для таго, каб дасягнуць сваіх мэтаў, пашырыць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці [14]. Адсюль і такія чытацкія кампетэнцыі, як: 1) успрыманне ці разуменне знакаў, значэння сэнсавых адзінак тэксту, 2) інтэграцыя сэнсаў, 3) інтэрпрэтацыя тэкстаў, 4) пошук неабходных тлумачэнняў, 5) абагульненне і ацэнка. Можна заўважыць, што развіццё чытацкай кампетэнцыі звязана не толькі з развіццём філалагічных навыкаў чытання і інтэрпрэтавання тэксту. Найбольшая ўвага павінна надавацца выпрацоўцы ў навучэнцаў умення працаваць з разнастайнымі тэкстамі, вылучаць у іх галоўнае і другаснае, разумець мэты аўтара, адрозніваць пункты поглядаў, акрамя таго, таксама востра запатрабавана неабходнасць фарміравання і рэальных жыццёвых кампетэнцый. Выхаванне чытацкіх кампетэнцый (як прафесійных кампетэнцый будучых бібліятэчных спецыялістаў) – прэрагатыва не толькі выкладчыкаў-філолагаў ці выкладчыкаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, але і ўсіх без выключэння настаўнікаў.

Апошнім часам пашырэнню культуры чытання ў Беларусі прысвячаецца шэраг праектаў: ад дзяржаўных да недзяржаўных, ад разавых да пастаянных, ад канцэптуальных да практычных. У 2016 г. адбыўся агульнабеларускі форум «Кніга= свет: сучасны стан і стратэгіі развіцця нацыянальнай прасторы чытання», арганізаваны Нацыянальным інстытутам адукацыі, выдавецкім домам «Звязда», Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (НББ), рэдакцыяй «Настаўніцкай газеты», выдавецтвам «Аверсэв», прадстаўніцтвам «Schneider Electric Industries SAS», прыватным прадпрыемствам «Гранд Райт». Выдавецкім домам «Звязда» была ініцыявана традыцыя заахвочвання лепшых бібліятэкараў сістэмы культуры і адукацыі дыпломамі «За пашырэнне чытацкай аўдыторыі прасторы беларускай літаратуры». У якасці часткі рэспубліканскага інфармацыйна-асветніцкага праекта на форуме ў НББ быў прэзентаваны і новы інтэрнэт-рэсурс «КнігаСвет» [6], які працягвае дзейнічаць у тэставым рэжыме на пляцоўцы Нацыянальнага інстытута адукацыі. Бібліятэкі Беларусі прыкладваюць пэўныя намаганні, каб ажыццяўляць падтрымку і прамоцыі лепшых узораў беларускай літаратуры. Напрыклад, НББ у 2017–2018 гг. праводзіла наву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кова-даследчую працу па распрацоўцы «Руководства по определению читательского спроса на издания современных белорусских авторов» (2018). Навуковая бібліятэка Нацыянальнага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта разам з Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй каардынуе праект «Городской книжный фестиваль “Город и Книги”» (з 2015 г.) [4]. З удзелам НББ праводзіцца Міжнародны сеткавы праект Нацыянальнага інстытута адукацыі «ЧтениеPRoДвижение» (з 2018 г.) [15], арганізатары якога ставяць задачу не толькі прыцягнуць увагу чытачоў да сучаснай літаратуры Беларусі, публікаваць біяграфічныя звесткі пра пісьменнікаў, у тым ліку спасылкі на аўтарскія блогі, сайты, але і электронныя версіі твораў, а таксама знаёміцца з чытацкімі інтарэсамі дзяцей і дарослых. Віртуальная інтэрнэт-пляцоўка «ЧтениеPRoДвижение: PRoЧитай – PRoДумай – PRoПиши», такім чынам, плануецца не толькі як прамоцыя сучаснай беларускай літаратуры (на беларускай і рускай мовах), але і як дзейснае камунікатыўнае асяроддзе для віртуальных зносін, жывога дыялогу пісьменнікаў, чытачоў, даследчыкаў, педагогаў.

Уласцівасцю Беларускага фестывалю інтэлектуальнай кнігі «Прадмова» (праводзіцца з 2018 г.), арганізатарам якога выступае ўстанова культуры «Кніжны офіс», з’яўляецца прамоцыя беларускамоўнай літаратуры і пашырэнне яе чытацкай аўдыторыі. На Фестывале праводзіцца выстава-продаж кніжнай прадукцыі беларускіх выдавецтваў за апошнія гады ў галіне інтэлектуальнай літаратуры і літаратуры non-fiction (інтэлектуальная проза, эсэістыка, філасофская і грамадская думка, навукова-папулярная літаратура, пераклады беларускіх аўтараў ці выдадзеныя на беларускай мове пераклады замежных аўтараў) [11]. На пашырэнне кнігазнаўчых ведаў у асяроддзі дзяцей 5–12 гадоў, у якім выкарыстоўваюцца інтэрактыўныя метады, а заняткі праводзяцца на беларускай мове, накіраваны праект «У госці да кніг» НББ (з 2016 г.) [12].

Названыя сучасныя праекты ў галіне прамоцыі кнігі і чытання аб’ядноўваюць педагогаў, бібліятэкараў, выдаўцоў, спрыяюць абмену вопытам, выпрацоўцы новых форм і метадаў, выбару прыярытэтнага і актуальнага інструментарыя па фарміраванні чытацкіх кампетэнцый ці чытацкай адукаванасці. Адначасова нельга забывацца, што форма застаецца толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формай і не павінна нівеліраваць сэнс усёй справы. Узгадаем, да прыкладу, заканадаўчыя дакументы, прынятыя ў сферы бліятэчнай і выдавецкай справы, а таксама ў галіне адукацыі, у якіх робіцца выразны акцэнт на нацыянальныя каштоўнасці беларускага народа. У «Законе аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (1995, 2014) замацавана, што асноўнымі прынцыпамі дзейнасці бібліятэк з'яўляюцца «вызначэнне агульначалавечых каштоўнасцей у якасці прыярытэтных; садзейнічанне адраджэнню і развіццю культурных традыцый і захаванню каштоўнасцей беларускай нацыі» (Артыкул 4) [2]. Першым прынцыпам выдавецкай справы, адзначаным у «Законе аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (2013), з'яўляецца «гуманізм і арыентацыя на агульначалавечыя каштоўнасці, зацвярджэнне і папулярызацыя нацыянальных каштоўнасцей» (Артыкул 5) [1]. У «Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі» (2011) адзначана таксама, што выхаванне грунтуецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа (Артыкул 18) [7]. У свой час яшчэ К. Д. Ушынскі прыкмеціў, што «воспитательные идеи каждого народа проникнуты национальностью более, чем что-либо другое, проникнуты до того, что невозможно и подумать перенести их на чуждую почву, и не удивлялись бы тогда, отчего, при переносе этих идей к нам, мы переносим только их мертвую форму, их безжизненный труп, а не их живое и оживляющее содержание» [13, с. 33]. Таму, безумоўна, нацыянальны складнік у выхаванні, як і выхаванне без нацыянальнай асновы, без нацыянальнага тэкста не будуць паўнавартаснымі.

Паводле першых вынікаў ацэнкі нацыянальнай сістэмы сярэдняй адукацыі, якія з'явіліся ў канцы 2019 г., дзякуючы даследаванням PISA-2018, у якіх упершыню ўдзельнічала Беларусь, наша краіна апынулася на 35–38 месцах (усяго ўдзельнічала каля 80 краін). Тым не менш, сярод вострых праблем, выяўленых у выніку тэсціравання, – наяўнасць у нашай сістэме адукацыі сацыяльна-дэфектыўных прыкмет аў. Вышэйшая адукацыя становіцца менш даступнай для сельскіх жыхароў, для тых, хто навучаецца на беларускай мове; адсутнічае інклюзіўнасць адукацыі, як і нацыянальная дзяржаўная адукацыйная палітыка. Але ж менавіта сістэме нацыянальнай адукацыі належыць галоўнае месца ў фарміраванні нацыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальнай свядомасці, якая захоўваецца пры ўмове, калі народ не губляе свае гістарычныя карані, зберагае і развівае сваю спадчыну, карыстаецца роднай мовай. Сёння існуе вострая патрэба фарміравання моўнай кампетэнцыі грамадства [8, с. 6–7], цесна звязанай з чытацкай кампетэнтнасцю.

Сусветны вопыт па дзяржаўнай падтрымцы і прамоцыі чытання ахоплівае краіны Еўропы і Азіі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, уключаны ў гэты працэс і асобныя краіны Афрыкі, якія займаюцца актыўнай падрыхтоўкай медыяадукаванага чытача. Пры тым, што кожная нацыя імкнецца захоўваць сваю мову і на ёй чытаць, глыбока разумеючы і спрыяючы даследаванню праблем чытання [9]. «А мы, – кажа педагог Ганна Севярынец, – працягваем выхоўваць дзяцей як грамадзян іншай краіны» [3]. Нам не хапае беларускага кантэнта, адпаведных сур’ёзных маркетынгавых даследаванняў па выяўленні чытацкіх прыярытэтаў, небюракратычнага рэгулявання і эксперыментальнай дзейнасці ў галіне кнігавыдання і распаўсюджання беларускай кнігі на розных медыяплатформах.

Вынікі бібліятэчных даследаванняў чытання ў Беларусі 1994–2016 гг., як адзначае першы намеснік дырэктара НББ А. Е. Далгаполава, «подтвердили гипотезу снижения интереса к национальной книге, неосведомленности о тенденциях развития современной литературы и были положены в основу разработки программ и проектов» [5, с. 14–16], у якіх удзельнічаюць супрацоўнікі бібліятэкі2. Аўтар упэўнена, што міждысцыплінарны падыход да вывучэння чытання на базе бібліятэк дазволіць актывізаваць працэс чытання і ўказвае на неабходнасць выкарыстання сацыялагічных, псіхалагічных, педагагічных, культуралагічных, этнаграфічных метадаў, да якіх можам дадаць філалагічныя, гістарычныя, бібліялагічныя і інш.

У сваю чаргу адзначым, што, распрацоўваючы канцэпцыю выхавання нацыянальнай чытацкай аўдыторыі, працуючы над тымі ці іншымі праектамі па прамоцыі чытання, неабходна ўлічваць і выкарыстоўваць менавіта комплексны падыход з

---

[2] Гл., напрыклад, на сайце НББ інфармацыю аб міжнароднай канферэнцыі «Развіццё нацыянальнай літаратуры і чытання ў краінах СНД», якая прайшла 30–31 кастр. 2019 г. у Маскве, у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by/by/news/nacyjanalnaja-biblijatjeka/ kanferentsyya-razvitstsye-natsyyanalnay-litaratury-i-chytannya-krainakh-snd/. – Дата доступу: 28.01.2020.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міждысцыплінарным наборам разнастайных інструментаў, які будзе ўключаць такія яго асноўныя складнікі, як 1) сістэмна-функцыянальны; 2) камунікатыўна-педагагічны; 3) лінгвістычна-культуралагічны.

Сістэмна-функцыянальны падыход праяўляецца ў тым, каб уяўляць усю дзяржаву як нацыю чытачоў, поспехі развіцця якой залежаць ад поспехаў чытання ў дзяцінстве і падлеткавым узросце, вызначаючы тым самым якасць і паспяховасць дарослага жыцця. Найбольшую значнасць у развіцці «нацыі чытачоў» мае дзяржаўная палітыка падтрымкі чытання (асабліва дзіцячага), шырокае ўкараненне якой у розных замежных краінах дае магчымасці для выпрацоўкі ўласных стратэгій, пошукаў разнастайных методык прамоцыі чытання дзяцей, моладзі і дарослага насельніцтва, узаемадзеяння педагогаў і бібліятэкараў. Падобныя праграмы па падтрымцы і прамоцыі чытання могуць развівацца па тых кірунках, якія маюць ключавое значэнне для той ці іншай краіны [16].

Камунікатыўна-педагагічны падыход мае на мэце педагагічнае ўзаемадзеянне і ў працэсе рэальнай жыццёвай камунікацыі, і ў адукацыйным працэсе з выкарыстаннем методык прамоцыі чытання: прамоцыі нацыянальнай кнігі, нацыянальнай літаратуры, нацыянальных адукацыйных тэкстаў.

У аснове лінгвістычна-культуралагічнага падыхода ляжыць кумулятыўная функцыя мовы, калі навучэнцы ўсведамляюць родную мову як сродак спасціжэння не толькі нацыянальнай, але і сусветнай культуры, у тым ліку, кніжнай культуры, як іх феномен. Нацыянальная мова ў чытацкай прасторы павінна стаць галоўным сродкам выхавання і развіцця.

Адпаведна гэтаму і ў Беларусі павінна з'явіцца дзяржаўная праграма па падтрымцы нацыянальнага чытання, накіраваная на фарміраванне і развіццё чытацкай і моўнай кампетэнцый, на выхаванне нацыянальнай чытацкай аўдыторыі. Чытанне павінна стаць базавым фактарам культуры і адукацыі, а значыць – перспектывай развіцця беларускай нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1.* Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь : Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 г. № 8-З // Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Рэжым доступу: http://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=H11200008. – Дата доступу: 27.02.2020.

*2.* Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» : Закон Республики Беларусь от 1 июля 2014 г. № 173-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 08.07.2014. – Рэжым доступу: http://pravo.by/document/?guid=3961&p0=H11400173. – Дата доступу: 27.02.2020.

*3.* Анонимный Скорина и Москва-река вместо Двины-реки. Педагог о том, что не так в белорусских школах [Электронный ресурс] / Интервью Марии Элешевич с Анной Северинец // Комсомольская правда. – 2020. – 12 февр. – Режим доступа: https://www.kp.by/daily/27090/4163009/. – Дата доступа: 27.02.2020.

*4.* Город и Книги [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bookfest.by/ru/. – Дата доступа: 27.02.2020.

*5. Долгополова, Е. Е.* Чтение как объект исследования: от академической традиции к междисциплинарному подходу / Е. Е. Долгополова // Бібліятэчны веснік. – 2019. – Вып. 11. – С. 7–18.

*6.* «КнігаСвет» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// kniga-svet.adu.by/. – Дата доступа: 28.01.2020.

*7.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13 студз. 2011 г. № 243-З (у рэд. Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2016 № 404-З). – Рэжым доступу: https://edu.gov.by/by-be/sistema-obrazovaniya/doshkolnoe-obrazovanie/normativnye-pravovye-akty/kodeksy-respubliki-belarus/index.php. – Дата доступу: 27.02.2020.

*8. Лукашанец, А. А.* Беларуская мова ў XXI ст.: асаблівасці развіцця і функцыянавання / А. А. Лукашанец // «Мова – Літаратура – Культура» : матэрыялы VI Міжнар. навук. канф. : у 2 ч. / БДУ. – Мінск, 2011. – Ч. 2, Мінск, 28–29 кастр. 2010 г. – С. 3–9.

*9. Мелентьева, Ю. П.* Итоги и перспективы проблем чтения / Ю. П. Мелентьева // Книга. Исследования и материалы. – 2014. – Сб. 100. – С. 39–45.

*10.* Місія была выкананая // Абрамовіч, П. Мой спосаб чытання: эсэ, нарысы, артыкулы, інтэрв'ю / П. Абрамовіч. – Мінск : Кнігазбор, 2019. – 156 с.

*11.* Прадмова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http:// pradmova.by/. – Дата доступу: 27.02.2020.

*12. Сапега, Т. А.* Інтэрактыўныя метады спазнання кніжнай культуры / Т. А. Сапега // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2017. – № 3. – С. 29–32.

*13. Ушинский, К. Д.* Собрание сочинений [Электронный ресурс] / К. Д. Ушинский. – Т. 33. – Режим доступа: https://imwerden.de/pdf/ushinsky_sobranie_sochineny_tom03_1948_text.pdf. – Дата доступа: 27.02.2020.

*14. Цукерман, Г. А.* Оценка читательской грамотности : материалы к обсуждению: 7 дек. 2010 года. Презентация и обсуждение первых результатов Международной программы PISA-2009 [Электронный

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ресурс] / Г. А. Цукерман. – Рос. акад. образ. – Режим доступа: http://2020strategy.ru/data/2011/07/15/1214720557/4.pdf/. – Дата доступа: 28.01.2020.

*15.* ЧтениеPRoДвижение [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://knigasvet.adu.by/be/chytacham/chtenieprodvizhenie.html. – Дата доступа: 27.02.2020.

*16. Чудинова, В. П.* Читательская грамотность и поддержка чтения: опыт разных стран [Электронный ресурс] / В. П. Чудинова // Университетская книга. – 2017. – Апрель. – Режим доступа: http://www.unkniga.ru/ kultura/7134-chitatelskaya-gramotnost-i-podderzhka-chteniya-opyt-raznyh-stran.html. – Дата доступа: 27.02.2020.

**Т. Н. Дробышева,** *старший преподаватель кафедры искусства эстрады*

# ПРИМЕНЕНИЕ ИННОВАЦИОННЫХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В ПОДГОТОВКЕ СТУДЕНТОВ С НАРУШЕНИЯМИ ЗРЕНИЯ ПО НАПРАВЛЕНИЮ СПЕЦИАЛЬНОСТИ «ИСКУССТВО ЭСТРАДЫ (ПЕНИЕ)»

Современные стандарты и жизненные ценности требуют постоянного обновления знаний, образования, повышения квалификации и компетенций в различных областях. И это требование касается граждан всех категорий. Доступность образования для людей с особенными потребностями является необходимым атрибутом современного общества, показателем цивилизованного отношения к будущему страны, исключающим дискриминацию по любым признакам.

К сожалению, в современном обществе существует проблема доступности образовательного процесса для людей с особенными потребностями. Оснащение образовательного процесса специальными средствами обучения и методиками для категории лиц с нарушением зрения в вузах минимально или вообще отсутствует, в штате вузов нет преподавателей, прошедших специальную подготовку для работы с данной категорией обучающихся, отсутствуют материально-технические средства доступности к объектам образовательной среды. Все эти факты делают участие в учебном процессе лиц с нарушением зрения весьма затрудненным. Тем не менее, обучение незрячих сту-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ